## XXIV ГАРЭЦКІЯ ЧЫТАННІ «МАКСІМ І ГАЎРЫЛА ГАРЭЦКІЯ. ЖЫЦЦЁ І ТВОРЧАСЦЬ»

## МІЖНАРОДНАЯ НАВУКОВА-ПРАКТЫЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

***(Мінск, 16 чэрвеня 2016 г.)***

Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя Гарэцкія чытанні – выбітная пляцоўка абмеркавання актуальных праблем галіны. Штогод яна прысвячаецца пэўнаму шэрагу тэм, якія пакуль не знайшлі дастаткова поўнага ўвасаблення ў працах айчынных філолагаў. У 2016 г. праблемнае поле канферэнцыі ўключала наступныя пытанні: сібірскае падарожжа М. Гарэцкага: роздум над лёсам беларусаў-перасяленцаў і будучыняй беларускай нацыі (па-мастацку ўвасоблены ў «Сібірскіх абразках»); рэпрэсаваныя пісьменнікі: лёсы, шляхі, скрыжаванні; роля братоў Гарэцкіх ва ўнармаванні беларускай мовы; Гаўрыла Гарэцкі і яго паслядоўнікі: агляд навуковай дзейнасці і дасягненняў і г.д.

Канферэнцыя ладзілася ў «Літаратурным музеі Петруся Броўкі» (філіяле Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры) пры падтрымцы Рэспубліканскага фонду братоў Гарэцкіх і Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Асаблівая ўвага была нададзена дзвюм значным датам: 50-годдзю вяртання Гаўрылы Гарэцкага на Беларусь і 95-годдзю з дня нараджэння Галіны Гарэцкай. Гэтым юбілеям прысвечана большасць дакладаў на пленарным паседжанні (Г. Запартыкі, Л. Савік, Р. Зінавай, Г. Гарэцкага, Т. Якубоўскай).

На пачатку працы адбылося выступленне Вольгі Бабковай і Аляксандра Паўлава, звязанае з гісторыяй пастаноўкі спектакля паводле аповесці М. Гарэцкага «Дзве душы». Прэм’ера адбылася 26 красавіка 2016 г. у Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы. Прайшла прэзентацыя кнігі доктара філалагічных навук, прафесара Таццяны Дасаевай «Беларуская літаратура XX – пачатку XXI стагоддзя» (2016).

З прывітальным словам выступілі пісьменнік і літаратуразнаўца Генрых Далідовіч, пісьменнік, старшыня Грамадскай назіральнай камісіі пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Анатоль Бутэвіч, гісторык, журналіст, грамадска-культурны дзеяч у ЗША Янка Запруднік.

Праца ўдзельнікаў канферэнцыі працягнулася па секцыях. Секцыя 1 займалася абмеркаваннем літаратурна-мастацкіх вартасцей «Сібірскіх абразкоў» М. Гарэцкага: разгледжаны асаблівасці псіхалагічнага пісьма (Т. Мацюхіна), праблемы самаідэнтыфікацыі беларуса ў чужым асяроддзі (В. Уткевіч, Л. Глазман), дачыненні «свайго» і «чужога» ў дадзеным цыкле апавяданняў (Е. Лявонава). На Секцыі 2 у асноўным былі заслуханы даклады кампаратывісцкага характару: «”Пад палкім сонцам Кастрычніка”: чалавек і рэвалюцыя ў творах Максіма Гарэцкага і Міхася Зарэцкага» Т. Грамадчанка, «Максім Гарэцкі і Вацлаў Ластоўскі: ідэйна-творчыя перасячэнні» А. Гурскай, «Ад міфалагічнага дрэва да роднага карэння. Мастацкая логіка Максіма Гарэцкага і Яна Баршчэўскага» Л. Леські, «Максім Гарэцкі ў творчым лёсе Янкі Брыля» В. Нікіфаравай. Секцыя 3 мела мовазнаўча-педагагічны характар: даклады С. Запрудскага «Да фарміравання некаторых сінанімічных радоў беларускай літаратурнай мовы (на матэрыяле “Практычнага расійска-беларускага слоўніка” 1926 г.)», І. Часнок «Дынаміка стылю Максіма Гарэцкага», І. Гоўзіч «Вывучэнне творчасці Максіма Гарэцкага ў сучасным адукацыйным асяроддзі» і інш.

Канфэрэнцыя скончылася выступамі арганізатараў, якія падвялі вынікі працы і вызначылі перспектывы вывучэння спадчыны Гаўрылы і Максіма Гарэцкага. Удзельнікі ўсклалі кветкі да помніка М. Гарэцкаму.

***З.І. Трацяк, кандыдат філалагічных навук***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***